ПАДЗЕЯ

# КНІЖНЫ ПАРАД ПЕРАМОЖЦАЎ

**10 лютага 2023 года ў літаратурным жыцці Прынёмання адбылася яркая падзея – прэзентацыя кніг пераможцаў IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі. Галоўнымі дзеючымі асобамі літаратурна-музычнай вечарыны пад сімвалічнай назвай «Мы падхапілі тваю песню» сталі паэтэсы Таццяна Яцук і Кацярына Каламійцава-Ігнацюк, літаратурны крытык Аліна Сабуць, дзіцячая пісьменніца Таццяна Сучкова.**




На вялікі жаль, з-за хваробы ў прэзентацыі не змагла прыняць удзел пятая пераможца мінулагодняга конкурсу рукапісаў, літаратуразнаўца, публіцыст Алена Руцкая. Адкрыла мерапрыемства старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч. Кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі Гродзеншчыны павіншавала пераможцаў, якія дзякуючы сваім перамогам сталі аўтарамі новых кніг, гэта значыць, не толькі папоўнілі ўласны творчы багаж, але і ўзбагацілі айчынную кніжную скарбніцу. Л. А. Кебіч нагадала аб выніках IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі, якія былі абвешчаныя ў Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь, 3 ліпеня 2022 года. Аўтары найбольш удалых рукапісаў атрымалі ўзнагароды ад Гродзенскага аблвыканкама – салідныя грашовыя прэміі на выданне сваіх твораў (гэтая асаблівасць зрабіла гродзенскі літаратурны конкурс унікальным). І вось з ператварэннем лепшых рукапісаў у кнігі выніковы этап конкурсу цалкам завершаны. Пра свае ўражанні ад конкурсных работ і рукапісаў пераможцаў распавёў член журы конкурсу, дырэктар навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы Мікалай Уладзіміравіч Грынько.




Адкрыла кніжны парад пераможцаў лаўрэат прэміі імя Цёткі ў намінацыі «Паэзія», член СПБ, беларуская паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён). Таццяна Мікалаеўна прэзентавала сваю кнігу вершаў «Зоркі ў прыполе» (Мінск, «Каўчэг», 2022). Аматары мастацкага слова рознага ўзросту, якія прыйшлі на прэзентацыю, з вуснаў паэткі пачулі, як стварaўся зборнік, як нараджалася яго ідэя, і самае галоўнае – як гучыць беларуская паэзія аўтара. Таццяна Мікалаеўна Яцук таксама сказала шмат цёплых слоў аб Гродзенскім абласным аддзяленні СПБ, ініцыятары галоўнага літаратурнага конкурсу Гродзеншчыны, які з гонарам носіць імя нашай славутай зямлячкі, паэтэсы, публіцыста, асветніцы Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч (Цёткі).

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, член СПБ, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць перамагла з рукапісам кнігі «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры ХХ-ХХІ стагоддзяў» (Мінск, Выдавецкі цэнтр БДУ, 2022; конкурсная намінацыя «Крытыка і літаратуразнаўства»). У прэзентацыі кнігі педагога, вучонага (фактычна гэта навуковая манаграфія) узялі ўдзел студэнты-філолагі ГрДУ імя Янкі Купалы, якія дапоўнілі аўтарскі аповяд аб кнізе цытаваннем радкоў з усіх яе раздзелаў. Дарэчы, у кнізе даследчыка значнае месца адведзена творчасці нашых калег па Гродзенскім абласным аддзяленні СПБ.

Вельмі каштоўнай для літаратурнага свету нашага краю з'яўляецца конкурсная намінацыя «Адкрыццё года». У правілах конкурсу яна з'явілася нядаўна, і карысць ад яе відавочная – з'яўленне новых таленавітых і перспектыўных аўтараў. Сваім арыгінальным бачаннем мастацтва паэтычнага слова з прысутнымі падзялілася пераможца конкурсу - 2022 у дадзенай намінацыі, гродзенская паэтэса Кацярына Каламійцава-Ігнацюк. Кацярына падзяліла свой пераможны рукапіс на дзве часткі і выступіла як аўтар адразу дзвюх кніг – зборнікаў лірыкі на рускай мове «Женщина в красном» і «Нет Никого Кроме Него» (Мінск, выдавецтва «Ковчег», 2022).

Творчасць члена СПБ, дзіцячай пісьменніцы з Гродна Таццяны Сучковай вядомая ў Беларусі. Таццяна Аркадзьеўна – ураджэнка Расіі, але вельмі палюбіла беларускую мову і напісала на ёй сваю пераможную кнігу ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» – зборнік казак, смяшынак і вершаў «Сонечная карусель» (Мінск, «Ковчег», 2022). Аўтар пазнаёміла аўдыторыю з творамі з усіх раздзелаў кнігі.



З музычнымі падарункамі віноўнікам урачыстасці выступіў мужчынскі вакальны гурт «Гарадзенцы» (мастацкі кіраўнік, кампазітар Валерый Кручкоў). Як літаратурны крытык свае асабістыя назіранні за мастацкім светам новых кніг агучыў член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Яго падарункі пераможцам конкурсу – аўтарскія аналітычныя артыкулы пра іх новыя кнігі друкуе газета «Літаратура і мастацтва».

З цёплымі словамі шчырых сяброўскіх віншаванняў да віноўнікаў урачыстасці звярнуліся калегі-пісьменнікі і супрацоўнікі ГрДУ імя Янкі Купалы. Па

традыцыі аўтары навінак падарылі іх Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага. Пісьменнікаў-пераможцаў вельмі цёпла павіншавала з нараджэннем новых кніг гаспадыня свята, дырэктар галоўнай бібліятэкі вобласці Марына Ігнатовіч. Дарэчы, Марына Эдвардаўна яшчэ і член журы конкурсу. Кіраўнік звярнулася да чытацкай аўдыторыі і заклікала прысутную моладзь надаваць увагу не толькі гаджэтам, перадавым тэхналогіям, але і кнігам.

Слухачы таксама пазнаёміліся з кнігай Алены Руцкай «Памятныя сустрэчы» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2022; перамога ў намінацыі «Публіцыстыка і краязнаўства»). У фінале мерапрыемства пад назвай «Мы падхапілі тваю песню» сваё лірычнае прысвячэнне несмяротнаму вобразу Цёткі, імя якой з гонарам носіць Гродзенскі абласны літаратурны конкурс, прачытала Людміла Антонаўна Кебіч. Постаць беларускай паэтэсы-класіка, справу якой годна працягваюць сучасныя літаратары Гродзеншчыны, у чарговы раз паслужыла для ўсіх крыніцай натхнення.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** «Мы падхапілі тваю песню»: падчас прэзентацыі кніг пераможцаў IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі. Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага. 10 лютага 2023 года.




Выступае пераможца IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі, аўтар зборніка лірыкі «Зоркі ў прыполе», беларуская паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён).





Таццяна Яцук і МікалайГрынько




Выступаюць пераможца IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі, аўтар кнігі «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў», літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць



і яе група падтрымкі – студэнты-філолагі ГрДУ імя Янкі Купалы




Кацярына Каламійцава-Ігнацюк




Таццяна Сучкова і яе кніга



Мужчынскі вакальны гурт «Гарадзенцы» (мастацкі кіраўнік В. М. Кручкоў)




Аліна Сабуць падарыла сваю кнігу Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага і навуковай бібліятэцы ГрДУ імя Янкі Купалы



Аліна Сабуць і Мікалай Грынько



Дзмітрый Радзівончык



Выступае дырэктар ГАНБ імя Я. Ф. Карскага М. Э. Ігнатовіч



М. Э. Ігнатовіч і Т. А. Сучкова



М. Э. Ігнатовіч і К. Каламійцава-Ігнацюк



А. Э. Сабуць з калегамі па ГрДУ імя Янкі Купалы




Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнавец, фальклярыст, член СПБ Руслан Казлоўскі




Паэтэса Людміла Шаўчэнка




Паэт Анатоль Апанасевіч



Таццяна Сучкова і пераможца ІІІ Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» Ганна Скаржынская-Савіцкая



Педагог, навуковец, пісьменніца Аліна Сабуць і студэнты-філолагі




Сонечная
6+
Женщина
в красном



Л. А. Кебіч, Таццяна і Анатоль Яцук

**Людміла Кебіч:**
**«Мы падхапілі тваю песню»**







*Фота* **Анатоля Апанасевіча**